DOI 10.33294/2523-4234-2021-31-1-248-278
УДК (7.046.3+745.04)476

**Галіна Аляксандраўна ФЛІКОП-СВІТА**
ORCID 0000-0002-0787-7548

# Царскія Брамы ўніяцкіх іканастасаў XVII – першай трэці XIX ст.: спосаб вырабу і асноўныя матывы разьбы

На падставе пісьмовых і візуальных крыніц, а таксама захаваных помнікаў былі вывучаны спосаб вырабу і асноўныя матывы разьбы Царскай брамы з царкоўнага іканастаса на тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага. Прасочваецца уніяцкі перыяд ад утварэння канфесіі да яе скасавання ў 1839 г. на Полацкім саборы. Устаноўлены асноўныя спосабы вырабу галоўных варот іканастаса: пісаныя па гладкай дошцы, разьбяныя, збітыя з планачак, плеценыя з саломкі. Сістэматызаваны звесткі пра асноўныя элементы дэкаратыўнай разьбы: лаза з гронкамі вінаграду, кветкавыя матывы, завіткі, матыў трэльяж ("у краткі"). Прыведзены ўдакладненыя звесткі пра час стварэння самабытных уласцівых выключна Палессю Царскіх Брамаў, плеценых з саломкі – 1834–1836 гг.

*Ключавыя словы*: Царская Брама, іканастас, царкоўная Уніі, грэка-каталіцкая Царква, дэкаратыўная разьба, пляценне з саломкі

**Halina Flikop-Svita**

**The Royal Gates of the Uniate Iconostasis of the XVII – the first third of the XIX century: method of manufacture and basic carving motifs**

On the basis of written and visual sources, as well as preserved monuments, the method of making and the main motifs of the carving of the Royal Gate from the church iconostasis of the territory of the former Grand Duchy of Lithuania are investigated. The union period from the formation of the denomination to its abolition in 1839 in the Polotsk Cathedral is traced. The considered monuments are stored mainly in the National Art Museum of the Republic of Belarus and the Museum of Ancient Belarusian Culture of the Center for Studies of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus. Expeditionary materials, which have been stored in the Museum of Ancient Russian Culture since the 1970s, are also studied. Working with artifacts revealed interesting examples of local arts and crafts in the Rococo style. At the same time, it is established that the existing Royal Gates, established before the middle of the 19th century, have hardly survived in the existing churches of Belarus.

New documents are involved in the development of the outlined scientific problem, which have not yet been used by specialists in the study of the iconostasis gate. This applies to a number of protocols of inspections (visits) of Uniate churches, which characterize the condition of temples in different regions. Acts of visits from the archives of Belarus, Russia, Lithuania and Poland are processed. It is mentioned those of them that contain interesting examples of the description of the Royal Gate. A number of iconographic sources are first introduced into scientific circulation. In particular, this applies to published fragments of drawings of iconostasis of the 1830's.

The main methods of making the main gate of the iconostasis are set: written on a smooth board, cut out, knocked down from slats, woven from straw. Information about the main elements of decorative carving: vines with bunches of grapes, floral motifs, curls, wallpaper motif (“in the lattice”) is systematized. Data on the time of creation of the original Royal Gate, woven from straw – 1834–1836, peculiar only to Polissya, are given.

*Keywords*: Royal Gate, iconostasis, Church Union, Greek Catholic Church, decorative carvings, straw weaving

**Галина Олександрівна Флікоп-Світа**

**Царські ворота уніатських іконостасів XVII – першої третини XIX ст.: спосіб виготовлення та основні мотиви різьблення**

На основі письмових та візуальних джерел, а також збережених пам’яток досліджено спосіб виготовлення та основні мотиви різьблення Царських воріт з церковних іконостасів території колишнього Великого князівства Литовського. Простежено унійний період від утворення конфесії до її скасування в 1839 р. на Полоцькому соборі. Розглянуто пам’ятники зберігаються переважно у Національному художньому музеї Республіки Білорусь та Музеї давньобілоруської культури Центру досліджень білоруської культури, мови та літератури Національної академії наук Білорусі. Також вивчались експедиційні матеріали, які з 1970-х рр. зберігаються в Музеї давньоруської культури. Робота з артефактами виявила цікаві приклади місцевого декоративно-прикладного мистецтва у стилі рококо. Водночас встановлено, що в існуючих церквах Білорусі майже не збереглися стародавні Царські ворота, створені до середини XIX століття.

Для розробки окресленої наукової проблеми були залучені нові документи, які не використовувались фахівцями при дослідженні іконостасних воріт. Це стосується низки протоколів перевірок (візитацій) уніатських церков, які характеризують стан храмів у різних регіонах. Опрацьовано акти візитацій з архівів Білорусі, Росії, Литви та Польщі. У статті згадуються саме ті з них, які містять цікаві приклади опису царських воріт. Низку іконографічних джерел вперше було введено в науковий обіг. Зокрема, це стосується опублікованих фрагментів малюнків іконостасів 1830-х рр.

Встановлено основні способи виготовлення головних воріт іконостаса: написані на гладкій дошці, вирізані, збиті з планок, плетені зі соломи. Систематизовано інформацію про основні елементи декоративної різьби: виноградні лози з гронами винограду, квіткові мотиви, кучері, мотив шпалер (“в решітці”). Наведено дані про час створення оригінальних царських воріт, витканих із соломи, – 1834–1836 рр., властивих лише Поліссю.

*Ключові слова*: Царські ворота, іконостас, церковна унія, Греко-католицька церква, декоративна різьба, соломоплетіння

Царскія Брамы як творы мастацтва ўяўляюць цікавасць не толькі для даследчыкаў сакральнага жывапісу, іканалогіі і іканаграфіі, але і для спецыялістаў, якія вывучаюць дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Да цяперашняга часу комплекснае даследаванне такіх помнікаў у Беларусі не праводзілася. Гэта дачтычтыцца як увогуле захаванай айчыннай спадчыны такога кшталту, так і асобна праваслаўных і ўніяцкіх Царскіх Брамаў. Для гісторыі беларускага мастацтва, а характэрная асаблівасць нашых земляў у шматканфесійнасці, цікавасць уяўляе параўнальны аспект, які б дазволіў устанавіць, ці была нейкая розніца ў спосабе вырабу, разьбяным дэкоры і сюжэце клеймаў паміж Царскімі Брамамі ў праваслаўных і грэка-каталіцкіх іканастасах.

Аднак, каб правесці такое кампаратывісцкае вывучэнне, неабходна мець грунтоўныя веды пра тое, якія ўвогуле сакральныя дзверы былі ўласцівы для кожнай з канфесій, а ўжо пасля гэтага іх параўноваць. Паколькі да цяперашняга моманту з’яўляецца не ўведзеным у навуковы ўжытак шэраг помнікаў, застаюцца невыяўленымі і / ці неапрацаванымі звесткі з пісьмовых крыніц, то першасным бачыцца выкананне менавіта такіх задач у даследаванні Царскіх Брамаў кожнай з канфесій. Таму **мэта** дадзенага артыкула заключаецца ў грунтоўным даследаванні Царскіх Брамаў уніяцкіх іканастасаў за ўвесь перыяд існавання гэтай канфесіі. Будуць вывучаны помнікі, якія захоўваюцца ў музейных зборах краіны і дзеючых храмах, а таксама будуць даследаваны пісьмовыя і выяўленчыя крыніцы па гэтым пытанні. У цэнтры ўвагі знаходзіцца спосаб вырабу сакральных дзвярэй, а таксама – асноўныя матывы іх разьбянога дэкору. Лагічным працягам гэтага артыкула з’яўляецца наша работа, прадстаўленая да друку ў навуковым зборніку “Історія релігій в Україні: актуальні питання” на 2021 г., дзе гаворка вядзецца пра сюжэты клеймаў. Там жа, каб пазбегнуць дублявання ілюстрацый, прыведзены іншыя выявы, якія тут не фігуруюць. Аднак яны дапаўняюць тыя прыклады, якія змешчаны ў гэтым артыкуле.

Хоць беларускія Царскія Брамы дагэтуль не выступалі аб’ектам усеахопнага грунтоўнага даследавання, аднак пэўныя пытанні, датычныя іх, ужо знаходзіліся ў цэнтры ўвагі нашых калег. Найперш адзначым, што некаторыя каштоўныя помнікі былі ўведзены ў навуковае карыстанне яшчэ ў 1980-ыя гг. Гэта датычыцца твораў, якія захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі РБ (далей – НММ РБ). Яны былі апублікаваны ў альбомах, складаніцай якіх выступала збіральніца калекцыі старажытнага беларускага мастацтва названага музея Н. Ф. Высоцкая [15; 25]. Помнікі, якія захоўваюцца ў Музеі старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей – МСБК), друкаваліся ў буклетах і даведніках гэтай установы, а ў 2004 і 2012 гг. былі прадстаўлены ў каляровых грунтоўных альбомах [21; 26]. Пяць гадоў таму адбылася першая тэматычная выстава ў НММ “Беларускі іканастас”, дзе акрамя абразоў экспанаваліся і Царскія Брамы [12].

Асноўныя напрацоўкі ў вывучэнні разьбы драўляных сакральных дзвярэй належаць даследчыку дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Я. М. Сахуту [13]. Ён жа звярнуў увагу і на ўнікальную мастацкую з’яву – саламяныя Царскія Брамы. Гэтую тэму грунтоўна распрацавала В. А. Лабачэўская, якой былі выяўленыя невядомыя дагэтуль прыклады такіх твораў, праведзена іх атрыбуцыя, устаноўлена імя першага ў беларускай навуцы адмыслоўца, які засяродзіў увагу на гэтай самабытнай з’яве яшчэ ў пачатку XX ст., – святар в. Дружылавічы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні Канстанцін Карпінскі [20].

Да нашага часу захаваліся некаторыя помнікі XVII – пачатку XIX ст., якія паходзяць з уніяцкіх цэркваў. Як правіла, яны ўяўляюць сабой сінтэз разьбы і жывапісу. Таксама дапаўняюць карціну пра ўніяцкія Царскія Брамы звесткі, узятыя з гістарычных дакументаў – візітаў (пратаколаў праверак) уніяцкіх храмаў. Намі

быў апрацаваны вялікі пласт такога роду крыніц, аднак па той прычыне, што далёка не ўсюды ў XVIII – першай трэці XIX ст. знаходзіліся іканастасы (а менавіта да гэтага часу належаць у асноўным захаваныя візіты: ад першага стагоддзя Уніі крыніц захавалася даволі няшмат і яны досыць спіплыя), то, зразумела, што і згадак пра Царскія Брамы атрымалася выявіць значна менш, чым было храмаў. Больш за тое, не ўсюды нават пры наяўнасці іканастаса і адпаведна, пры захаванні ў ім Царскай Брамы прыводзяцца вычарпальныя апісанні: у большасці выпадкаў яны даволі абагульненыя. Напрыклад, проста адзначаецца, што Царская Брама разьбяная або гладкая. Часам указана колькасць клеймаў, але не пералічваюцца сюжэты. Аднак некаторыя візіты вылучаюцца падрабязнасцю. Так, пры апісанні іканастасных дзвярэй адзначаецца спосаб іх вырабу (сталярныя ці разьбяныя), прыводзяцца сюжэты жывапісных клеймаў, бывае адзначаецца матыў разьбы альбо зафіксавана яе адсутнасць (гладкая). Менавіта звесткі з такіх дакументаў і былі прыведзены ў дадзенай рабоце. Адпаведна, у спісе крыніц яны і адлюстраваны, хаця, як і было адзначана вышэй, пратаколаў праверак храмаў было апрацавана значна больш і вывучаліся яны мэтанакіравана і сістэмна, хоць з праведзенага спісу можа падацца, што прадстаўленыя дакументы – гэта выпадковая выбарка.

У візітах маюцца і даволі цікавыя апісанні, але гэта найперш датычыцца тых Царскіх Брамаў, якія адрозніваліся ад агульнай масы твораў. Напрыклад у 1738 г. у царкве в. Цешылава Мядзельскага дэканату (Пастаўскі р-н Віцебскай вобласці) пра іканастасныя дзверы ў візіце гаворыцца, што яны абклееныя папяровымі абразамі [27, арк. 7.]. Відавочна, што маюцца на ўвазе гравюры. Можна сабе ўявіць гэтую браму, якая была прадстаўлена гладкімі драўлянымі створкамі, да якіх былі прымацаваны друкаваныя адбіткі рэлігійнага зместу. У дакументах гэта адзіная згадка пра такі выраб. Натуральна, што гэта сведчыць пра беднасць царквы, аднак нельга не адзначыць кемлівасць “майстра”, якім мог быць настаяцель.

## “Гладкія” Царскія Брамы

Што датычыцца першых дзесяцігоддзяў Уніі, то ад гэтага часу амаль не захавалася артэфактаў і зусім няма літаратурных апісанняў. Меркаваць пра выгляд Царскіх Брамаў XVII ст. можна толькі на падставе адзінкавых дайшоўшых ад гэтай пары помнікаў і рэдкіх іканаграфічных крыніцах. Да нешматлікіх твораў названага перыяду належыць Царская Брама з в. Пінкавічы Пінскага р-на Брэсцкай вобл. (*іл. 1*). Помнік датуецца канцом XVII ст. [19, іл. 50]. Цікава, што Царская Брама ў адрозненні ад большасці вядомых твораў такога кшталту не мае разьбы, а ўяўляе сабой гладка апрацаваную драўляную дошку з шасцю жывапіснымі клеймамі, паміж якімі фон замаляваны блакітнай фарбай, а вакол выяў, як імітацыя разьбяных раслінных матываў, намалявана вохрыстай фарбай лісце. Сюжэты медальёнаў з’яўляюцца традыцыйнымі: у верхніх двух прадстаўлена “Дабравесце”, у астатніх – паясныя постаці чатырох Евангелістаў. На думку Н. Ф. Высоцкай, чатыры кампазіцыі ў ніжніх клеймах створаны пад уплывам гравюр з кніг, выдадзеных друкарняй Куцеінскага манастыра, “Новы Запавет” (1652) і “Актоіх” (1646) [19, іл. 50].



*Іл. 1. Царская Брама
з в. Пінкавічы Пінскага р-на Брэсцкай вобл.*

Пільнае параўнанне названых графічных выяў з жывапіснымі клеймамі Царскай Брамы не дазваляе пагадзіцца з прыведзеным меркаваннем даследчыцы.

Прадстаўленая Царская Брама звяртае ўвагу і па іншых прычынах. Перш за ўсё, гэта адзіны дайшоўшы да нашага часу такога кшталту сакральны аб’ект, які складаецца не з дзвюх створак, што было традыцыйным, а – з адной. Акрамя таго прываблівае ўвагу дэкаратыўны малюнак вакол сюжэтных клеймаў. Справа ў тым, што тут выразна прасочваецца імкненне мастака да перадачы аб’ёму. Напрошваюцца думкі пра выкарыстанне прыёму ілюзорнага жывапісу: такое адчуванне, што майстар, малюючы гэтыя раслінныя аздобы, хацеў стварыць ілюзію разьбы.

Такі прыём у беларускім мастацтве вельмі актыўна выкарыстоўваўся ў XVIII ст., асабліва ў другой яго палове. Тут жа звяртае на сябе ўвагу выкарыстанне ілюзорнага жывапісу ў творы, які даследчыкамі прынята датаваць канцом XVII ст. Цікава і тое, што дадзены помнік дазваляе выказаць здагадку пра існаванне і ўвогуле пра вялікае распаўсюджанне да гэтага часу разьбяных Царскіх Брамаў. На такую думку наводзіць тая акалічнасць, што майстар-стваральнік імкнуўся жывапіснымі сродкамі стварыць ілюзію разьбы. А значыць, што якраз разьбяныя сакральныя дзверы іканастаса былі найбольш тыповымі ў гэты перыяд.



*Іл. 2. Двустворкавая Царская Брама з в. Дабраслаўка на Піншчыне. МСБК, ж-073*

Што датычыцца ўласна прыёму ілюзорнага жывапісу, то з візітацыйных актаў вядомы і іншыя прыклады яго выкарыстання для выканання Царскіх Брамаў. Так, у царкве Св. Троіцы в. Маркава Вілейскага дэканату (Маладзечанскі р-н Мінскай вобл.) на 1799 г. галоўныя дзверы іканастаса згадваюцца як "аптычна маляваныя" [3, арк. 253–254 адв.].

Вяртаючыся да пінкавіцкай Царскай Брамы, нельга не сказаць пра далейшы яе лёс. На нейкім этапе пры пераўладкаванні іканастаса яна саступіла месца новай, а сама ў перарobленым выглядзе заняла месца дыяканскіх дзвярэй: паверх першаснай выявы быў намаляваны Св. Стэфан. На жаль, гэтая выява страчана, бо пад час рэстаўрацыі верхні жывапісны слой быў зняты, каб адкрыць аўтарскі жывапіс. Уяўленне пра яго даюць старыя здымкі [16, іл. 59]. Такім чынам, прыведзеная выява дапаўняе шэраг прыкладаў, прадстаўленых у папярэднім раздзеле, дзе гаворка вялася пра сюжэты на дыяканскіх дзвярах.

Адзначым, што такое перафункцыянаванне Царскай Брамы было не адзінкавым. Вядомы і іншыя прыклады. У царкве Св. Кузьмы і Дзям'яна в. Наройкі Драгічынскага дэканата (Польшча) на 1757 г. "Царская Брама са старой царквы была пераўтворана ў паўночныя і ўсходнія дзверы пры галоўным алтары" [1, арк. 27 адв.].

XVII стагоддзем датуецца яшчэ адзін помнік з гэтага ж рэгіёну – двустворкавая Царская Брама з в. Дабраслаўка на Піншчыне (*іл. 2*), якая захоўваецца ў МСБК [30, с. 58]. На жаль, складана сказаць пра канфесійную прыналежнасць гэтага музейнага прадмета, бо датаванне яго вельмі шырокае, і ён мог быць створаны яшчэ ў той час, калі царква была праваслаўнай. Таму нельга сцвярджаць, што дадзеная Царская Брама з'яўляецца менавіта ўніяцкай мастацкай спадчынай, але яна выразна ілюструе тэндэнцыі XVII ст. Дадзены твор не мае разьбы, а ўяўляе сабой дзве створкі, на кожнай з якіх змешчаны прамавугольныя клеймы, раздзеленыя паміж сабой драўлянымі нешырокімі планкамі.

Такім чынам, абодва вядомыя нам помнікі XVII ст. з'яўляюцца ўзорамі "гладкай работы", бо выкананы толькі пры выкарыстанні жывапісных сродкаў. З такой жа характарыстыкай часам Царскія Брамы фігуруюць і ў гістарычных крыніцах. У адрозненне ад разьбяных, іх было зусім не шмат і пэўнага адзінства тут не назіраецца. Так, гладкія Царскія Брамы існавалі ў розных рэгіёнах і звесткі пра іх занатаваны ў дакументах сярэдзіны XVIII ст., а таксама ажно ў пачатку XIX ст. Напрыклад, Царская Брама "гладкай работы" знаходзілася ў царкве Узвядзення Крыжа в. Харастыта Уладаўскага дэканату (Польшча) у 1759 г., "цалкам маляваная без разьбы" у той жа час была ў царкве Св. Міхаіла в. Полаўцы Камянецкага дэканату (Польшча), такая ж і ў царкве Апекі в. Даўгалісце Уладаўскага дэканату (Польшча) [7, с. 263, 377, 403]. У 1802 г. у храме Апекі Божай Маці в. Вежкі Камянецкага дэканату (Жабінкаўскі р-н Брэсцкай вобл.) мелася Царская Брама "гладкай работы, пафарбаваныя ў чырвоны, з выявамі чатырох Евангелістаў" [9, арк. 129]. Выкананыя гэткім жа спосабам сакральныя дзверы іканастаса, пра якія адзначаецца, што яны старыя,



*Іл. 3. Барэльефныя сюжэты на Царскіх Брамах*
*з в. Альманы Столінскага р-на Брэсцкай вобл. МСБК, ск-10*

знаходзіліся ва ўсходнім рэгіёне – у царкве Св. Пятра і Паўла в. Панятоўка Засожскага дэканату (Расія) ажно ў 1822 г. [28, арк. 130].

Прыкладам пэўнага пераходу ад гладкай да разьбяной Царскай Брамы з’яўляецца помнік другой паловы XVII ст. з в. Альманы Столінскага р-на Брэсцкай вобл., які захоўваецца ў МСБК [21, с. 156 – 157]. На драўляную дошку насены шэсць жывапісных выяў, вакол якіх прымацаваны выразаныя з дрэва чатырохпялёсткавыя кветкі з завіткамі лісцяў (*іл. 3*).

Шматлікія прыклады разьбяных Царскіх Брамаў, пра якія размова пойдзе ніжэй, пры адрозненні дэкаратыўных матываў маюць асноўнае падабенства ў тым, што з’яўляюцца творамі, якія спалучаюць у сабе дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і жывапіс. Прычым разьба ў XVIII ст. была скразной, што надавала ажурнасць такім творам. Аднак ад XVII ст. захаваліся цікавыя прыклады, калі сакральныя дзверы былі цалкам выпрашаны пластычна. У гэтым выпадку не толькі дэкор выкол клеймаў быў выразаны з дрэва, але і самі клеймы былі разьбянымі, праўда яны ўяўлялі сабой творы не скразной разьбы, а – барэльефы.

Да іх ліку належыць выдатны помнік з царквы Пераўтварэння в. Варанілавічы Пружанскага р-ну Брэсцкай вобл. (*іл. 4*). Паводле апошняй атрыбуцыі, ён датуецца 1-ай паловай XVII ст. [33, с. 174]. Тут рэльефна выкананы шэсць сюжэтных клеймаў, якія запаўняюць сабой усю плошчу дзвярэй. Дэкаратыўны элементы ў выглядзе раслін ці кратак адсутнічаюць. На жаль, па гэтай царкве нам вядома толькі візіта 1784 г. Іканастаса ў храме тады ўжо не было, Царская Брама не згадваецца [8, арк. 78 адв.].

Унікальным помнікам з’яўляюцца двухстворкавыя разьбяныя дзверы з царквы Св. Юрыя-Змеяборца г. Віцебска, якія былі выкананы каля 1690 г. [33, с. 176]. У ранейшых публікацыях яны фігуравалі як Царская Брама, паводле новай атрыбуцыі – яны з’яўляюцца ўваходнымі дзвярыма ў царкву. У любым выпадку твор з’яўляецца выдатным узорам разьбярскага мастацтва на Беларусі. Тут звяртаюць на сябе ўвагу сюжэты клеймаў, дзе прадстаўлены чатыры евангелісты, Св. Мікалай і Св. Сімяон Слупнік. Зразумела, што, калі гэта ўваходныя дзверы, а не Царская Брама, то помнік не датычыцца дадзенай тэмы даследавання. Адзначым, што гэта не адзіныя вядомыя ўваходныя разьбяныя дзверы ў віцебскім храме. Так, у царкве Св. Троіцы праваслаўнага Маркава манастыра яны таксама былі такога кшталту.

У любым выпадку прыведзеныя прыклады сведчаць пра такую мастацкую з’яву, як рэльефна выкананыя дзверы. З візітаў вядомы і іншыя прыклады, якіх, праўда, было мала. Так, у царкве Успення в. Чыжы Бельскага дэканату (Польшча) на 1759 г. была Царская Брама “у розныя кветкі і разьбяныя фігуркі” [4, с. 885]. Вывучэнне стылістыкі разьбы захаваных Царскіх Брамаў і выкарыстанне гэтых звестак у атрыбуцыі помнікаў можа стаць тэмай асобнага даследавання ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.



*Іл. 4. Царска Брама з царквы Пераўтварэння в. Варанілавічы Пружанскага р-ну Брэсцкай вобл.*

## Разьбяныя Царскія Брамы

Хаця, безумоўна, што ў той жа час існавалі і ажурныя разьбяныя Царскія Брамы [13, с. 170]. Яскравым узорам такога помніка, выкананага на выключным узроўні, з'яўляюцца сакральныя дзверы сярэдзіны XVII ст. з іканастаса Дабравешчанскай царквы кляштара ў Супраслі (*іл. 5*). Гэтая брама была выканана тады ж, калі і ўвесь іканастас, дакладныя гады вырабу і аўтарства якога з'яўляюцца дыскусійным, бо розныя аўтары падаюць розныя версіі, аднак відавочна, што гэта была сярэдзіна XVII ст. [11]. Гэты твор і прыведзеныя вышэй праз параўнанне выразна дэманструюць, як развівалася сакральнае мастацтва ў той час у буйных духоўных цэнтрах і маленькіх паселішчах.

Узровень майстэрства разьбяра, безумоўна, уражвае. Звяртае на сябе ўвагу матыў малюнка і агульная кампазіцыя. Візуальным акцэнтам з'яўляецца Крыж, які быццам бы ўсталяваны ў вазу, а на сяродкрыжжы знаходзіцца Херувім. Таксама тварыкі хірувімаў, пададзеныя ў профіль, закампанаваны сярод лазы і вінаградных гронак. Прываблівае і дэкор дзвярных адкосаў, дзе змешчаны гарэльефныя фігуры анёлаў са складзенымі ў малельным жэсце далонямі. Нельга не адзначыць, што разьба тут запаўняе ўсю прастору і першапачаткова месца для жывапісных клеймаў запланавана не было.

З апісанняў у візітах вядома пра існаванне і іншых Царскіх Брамаў, аздобленых фігуратыўнай разьбой. На 1759 г. у царкве Нараджэння Божай Маці мястэчка Дзівін Палескага дэканату (Кобрынскі р-н Брэсцкай вобл.) знаходзіліся "Царскія вароты […] з разьбянымі фігуркамі […] Над імі балдахін […] па краях фігуры Апосталаў Пятра і Паўла, паміж якімі абраз "Тайнай Вячэры" ў раме, упрыгожанай разьбянымі кветкамі" [7, с. 183]. Гэтае апісанне дае даволі яскравае ўяўленне пра комплекс твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, які аздабляў цэнтральную частку іканастаса. Не вядома, праўда, якія менавіта фігуркі былі ўплецены ў разьбу Царскай Брамы, аднак можна меркаваць, што гаворка ідзе пра анёлаў і херувімаў.

Прыкладам выкарыстання матыву лазы з пладамі і лісцямі з'яўляюцца і некаторыя іншыя ўніяцкія сакральныя дзверы: з могільнікавай Пакроўскай царквы г. Петрыкава Гомельскай вобл. (пачатак XVIII ст.), Крыжаўзвіжанскай царквы аг. Аброва Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. (сярэдзіна XVIII ст.) – абедзьве захоўваюцца ў НММ РБ [21, с. 163; 25, іл. 110]. У МСБК знаходзіцца цікавая паводле малюнка разьбы Царская Брама пачатку XIX ст., якая паходзіць з царквы Святой Параскевы аг. Опаль Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл. [20, с. 130]. Незвычайным тут з'яўляецца тое, што лісты, плады і сцяблiны вінаграду, якія фарміруюць аздобу вакол жывапісных клеймаў, выкананы плоскасна, выразаны яны толькі па контуры і размаляваны фарбамі, што стварае ўражанне аб'ёму, дзякуючы светла-ценявой мадэліроўцы (*іл. 6*).

Падобным чынам выканана і Царская Брама з в. Стрэльна Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл., якая захоўваецца ў НММ РБ. Стылістычнае падабенства гэтых



*Іл. 5. Сакральныя дзверы сярэдзіны XVII ст. з іканастаса кляштара ў Супраслі. Сярэдзіна XVII ст.*

твораў і вельмі блізкая жывапісная манера, агульны рэгіён бытавання дазваляюць выказаць думку пра іх агульнае аўтарства. Помнік са Стрэльны датаваны, бо мае надпіс з датай "1803 г." [20, с. 131].

Прыгожая, з вытанчанай разьбой Царская Брама, у якой таксама асноўным матывам была лаза з гронкамі вінаграду, знаходзілася ў іканастасе царквы в. Галоўчыцы Кобрынскага павета на пачатак XX ст. Яна зафіксавана на фота (*іл. 7*), дзе прадстаўлены невялікі іканастас храма, які быў усталяваны, як сведчаць архіўныя дакументы, у 1875 г. [18, арк. 2–3]. Царская Брама, відавочна, больш ранняя. Аснову яе кампазіцыі фарміруе лаза, якая выгінаецца вакол шасці клеймаў з традыцыйнымі выявамі "Дабравесця" і чатырох Евангелістаў.

Акрамя таго, даволі распаўсюджаным малюнкам разьбы з'яўляюцца завіткі лістоў і сцяблін, часам з выкарыстаннем кветак. Адрозненне ад вышэй апісанага матыву заключаецца ў тым, што ў такім выпадку не было гронак вінаграду. Хаця іншыя кампаненты кампазіцыі, як правіла, стылістычна і тэхнічна выкананы былі ў падобнай манеры. Прыкладам з'яўляюцца наступныя помнікі, якія зараз захоўваюцца ў НММ РБ: з царквы Св. Мікалая аг. Дружалавічы Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл. (*іл. 8*) (трэцяя чвэрць XVIII ст. [29, с. 158]), царквы Св. Троіцы в. Аздамічы Столінскага р-на Брэсцкай вобл. (канец XVIII ст. [29, с. 175]). Першы з названых прываблівае малюнкам разьбы, дзе акрамя лістоў і сцяблін прысутнічаюць валошкі ці гваздзікі. Другі з названых складаецца з даволі аднастайнага расліннага матыву, які на кожнай створцы дублюецца тройчы ў прамежку паміж жывапіснымі клеймамі.

Два шыкоўныя помнікі, якія можна аднесці да мастацтва ракако, паходзяць з Брэсцкага раёна. Гаворка ідзе пра вароты з в. Прылукі (*іл. 9*), якія захоўваюцца ў МСБК [21, с. 162], і пра вароты, якія знаходзяцца ў царкве в. Шумакі (*іл. 10*). Характэрнай рысай гэтых брамаў з'яўляецца віртуознае ўключэнне жывапісных клеймаў дэкор. Сама іх форма гарманічна дапасуецца да асноўнага матыву разьбы – завіткоў. У Царскай Браме з Шумакоў, якая ў навуковы зварот уводзіцца ўпершыню, назіраецца большае мастацкае разняволенне, чым у помніку з Прылукаў.

Пэўнае распаўсюджанне атрымалі і Царскія Брамы "ў краткі". Аснова такіх дзвярэй сфарміравана перакрыжаванымі паміж сабой планачкамі, якія, як правіла, ўтвараюць роўнабаковыя невялікія ромбы, а ў іх кутах змяшчаюцца кветкі. Два такога кшталту помнікі сярэдзіны XVIII ст. захоўваюцца ў НММ РБ. Адзін з іх паходзіць з в. Студзянец Кармянскага р-на Магілёўскай вобласці (*іл. 11*), другі – з Віцебшчыны (дакладнае месца бытавання не вядома, бо Царская Брама ў музейныя зборы паступіла ў даваенны перыяд) [25, іл. 135, 136].

Магчыма, менавіта такога кшталту Царскія Брамы знаходзіліся ў іканастасах Мікалаеўскай царквы мястэчка Веляшковічы (Лёзненскі р-н Віцебскай вобл.), Ільінскай – в. Гаралёва (цяпер не існуе) – абедзве Веляшковіцкага дэканату 1822 г. [23, арк. 110, 127], Мікалаеўскай – мястэчка Дзісна Галубецкага дэканату (Мёрскі р-н Віцебскай вобл.) у 1789 г. [2, арк. 23 адв.–24], бо ў візітацыйных актах яны фігуруюць з характарыстыкай "w kraty". Па ўсёй верагоднасці, такі



*Іл 6. Царская Брама з царквы Святой Параскевы аг. Опаль Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл. Пач. XIX ст. МСБК, dp-280*




*Іл. 7. Царская Брама ў іканастасе царквы в. Галоўчыцы Кобрынскага павета.
Фото пач. ХХ ст. Ф. 1. 1913 д. 100 л. 5.*

спосаб аздобы сакральных дзвярэй – з’ява даволі позняя, так як і дайшоўшыя да нашага часу помнікі, і згадкі ў гістарычных крыніцах, даюць падставы меркаваць пра ўзнікненне яе толькі ў сярэдзіне XVIII ст. Больш за тое, захаваныя і вядомыя па дакументах такога кшталту Царскія Брамы схіляюць да думкі пра існаванне лакальнай традыцыі – выразна заўважна, што ўсе прыклады належаць да Віцебшчыны і Магілёўшчыны.

## Царскія Брамы, збітыя з планачак

У XIX ст. Царскія Брамы “у краты” працягвалі вырабляць для храмаў, сведчаннем чаго з’яўляецца праект іканастаса для адной з цэркваў Мазырскага павета Мінскай губерні, гіпатэтычна для – Тонежскай, намаляваны у 1834 г. [31, каляр. уклейка]. На чарцяжы выразна бачны і плануемыя сакральныя дзверы (*іл. 12*). Яны меліся быць выкананы пры выкарыстанні драўляных планачак, якія павінны былі перакрыжоўвацца, утвараючы ромбы, і чатырохпялёсткавыя кветкі. Не вядома, ці быў гэты праект рэалізаваны, аднак, відавочна, у тыя часы такія Царскія Брамы былі ва ўжытку.



*Іл. 8. Царская Брама з царквы Св. Мікалая аг. Дружалавічы Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл. Трэцяя чвэрць XVIII ст. НММ kp-14360-03*



*Іл. 9. Вароты з в. Прылукі. МСБК, кр-280-281*



*Іл. 10. Вароты, якія знаходзяцца ў царкве в. Шумакі*



*Іл. 11. Царскія Брамы “ў краткі” з в. Студзянец Кармянскага р-на Магілёўскай вобласці. Сярэдзіна XVIII ст. НММ, kp-02120-01.*



*Іл. 12. Сакральныя дзверы ўхвальскай царквы.*
*NIAB_136_1_10517_140*

А вось іншы чарцёж гэтага перыяду дакладна для нас занатаваў выгляд узведзенага ў 1837 г. іканастаса, у якім таксама Царская Брама была “ў краткі”. Гаворка ідзе пра сакральныя дзверы ўхвальскай царквы, дзе іканастас быў ужо ўсталяваны пасля пераводу царквы ў праваслаўе [32]. Таму нельга сцвярджаць пра прыналежнасць да ўніяцкай спадчыны Царскай Брамы з гэтай царквы, але яна працягвае ранейшую традыцыю ў аздобе такім спосабам.

Праўда адносна ўхвальскай Царскай Брамы трэба сказаць, што чарцёж, магчыма, зафіксаваў не перакрыжаваныя планачкі, якія ўтваралі аснову створак, а – іх роспіс. Інакш кажучы, прадстаўленыя ромбы маглі быць намаляваны на суцэльнай драўлянай аснове. Такія прыклады вядомыя і сярод захаваных помнікаў, якія паходзяць з ХІХ ст. Так, у МСБК захоўваецца Царская Брама з в. Пагост-Загародскі Пінскага р-на Брэсцкай вобласці, якая зроблена з драўляных дошак, пафарбавана, і для яе аздобы на фон блакітнага колеру нанесена белай фарбай сетка ромбікаў (*іл. 13*).

Узнікненне ў другой палове XVIII ст. такога спосабу дэкарыравання сакральных дзвярэй, відавочна, тлумачыцца праявамі стылю ракако, які на беларускіх землях найбольш выразна праявіў сябе ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (перш за ўсё ў арыстакратычных прадметах інтэр’еру і побыту), з яго адметным матывам “трэльяж”. Абранне такога матыву для аздобы Царскай Брамы, верагодна, было не выпадковым і тлумачылася не толькі тагачаснай модай у рэчышчы агучанага стылю, але і мела пэўную семантыку. Трэльяжы –



*Іл. 13. Царская Брама з в. Пагост-Загародскі Пінскага р-на Брэсцкай вобласці. МСБК_DP_294_294a*

гэты збітыя з планачак краткі, прызначаныя перш за ўсё ў еўрапейскіх садах для таго, каб за іх чаплялася вінаградная лаза. Выкарыстанне гэтай формы для дэкору Царскай Брамы як быццам утрымлівае адсылку да вінаграднай лазы. Нагадаем, што вінаградная лаза – шырока пашыраны матыў у эпоху барока, безумоўна, праз сімвалы і алегорыі перадаваў ідэю пераўтварэння віна ў кроў Хрыстову.

Пазней, у XIX ст. матыў “у краткі” яшчэ больш спрасціўся, што, відаць, тлумачылася ўплывам класіцызму, для якога ўласціва імкненне да простых форм. Такім чынам, у XIX ст. назіраецца адмаўленне ад ажурнай скразной разьбы і вяртанне да больш лаканічнага выгляду Царскіх Брамаў. Спосаб вырабу таксама мяняецца і замест пpаразання з дрэва выкарыстоўваецца збіванне планак. Магчыма гэта тлумачыцца не толькі пытаннямі моды альбо розным успрыняццем прыгажосці ў розныя перыяды, а і практычнымі фактарамі. У XIX ст. пры падрыхтоўцы да скасавання Уніі ў цэрквах масава ўзводзіліся іканастасы. Гэтую справу трэба было выканаць хутка. Па названай прычыне святары маглі пайсці найбольш простым шляхам і заказаць іканастас (з адпаведнымі кампанентамі, у тым ліку – Царскай Брамай) максімальна просты, які патрабаваў не шмат часу для вырабу, і танны. Магчыма гэтым жа і тлумачыцца сціплы выгляд прыведзенай Царскай Брамы XIX ст. з в. Пагост-Загародскі.

Верагодна, у гэты ж час, пры паступовым згасанні традыцыі ажурнай скразной разьбы, з’яўляецца яшчэ адзін спосаб вырабу сакральных дзвярэй. Дайшоўшыя да нашага часу выявы сведчаць пра тое, што часам Царская Брама выконвалася наступным чынам: у цэнтры кампазіцыі быў крыж, зроблены з драўляных дошак, ад яго ў розныя бакі разыходзіліся “промні” – вузкія драўляныя планкі. А ўжо да іх прымацоўваліся клеймы з жывапіснымі выявамі. У гэтым выпадку, у адрозненне ад Царскіх Брамаў са скразной ажурнай разьбой, клеймы маглі быць з лёгкасцю дэманціраваны і пры неабходнасці заменены новымі. Гэта было больш прыктычна, аднак ў такіх Царскіх Брамах жывапісныя медальёны ўжо не стваралі цэльную кампазіцыю з разьбой.

Прыкладамі могуць з’яўляцца вядомыя па старых фотаздымках і малюнках сакральныя дзверы з іканастасаў Віцебскіх Троіцкай і Успенскай цэркваў (*іл. 14*). У першай з названых такая Царская Брама зафіксавана на здымку 1915 г., а ў апісанні храма ў канцы XIX ст. пра яе гаворыцца, што яна больш новая за ўвесь іканастас (апошні быў выкананы, верагодна, у канцы XVIII ст.) [17, арк. 26]. Царская Брама Успенскага сабора зафіксавана на малюнку 1835 г. [24]. Гэта яшчэ раз пацвярджае выказаную вышэй думку, што акурат у той перыяд такі спосаб вырабу сакральных дзвярэй ужо існаваў.



*Іл. 14. Сакральныя дзверы з іканастасаў Віцебскайх Троіцкай цэркваў*

## Царскія Брамы, плеценыя з саломкі

Завяршаючы гаворку пра кампазіцыю дэкору і спосабы вырабу Царскіх Брамаў, нельга не згадаць унікальныя помнікі, зробленыя ў незвычайнай для такога роду рэчаў тэхніцы. Гаворка ідзе пра сакральныя дзверы, выкананыя пляценнем саломкай. Тэхнічная адметнасць такога роду твораў, іх мастацкая выразнасць, а таксама выключная “беларускасць” (бо саламяныя Царскія Брамы – з’ява, вядомая ў айчынным мастацтве і ў памежных з Беларуссю вёсках Украіны) абумовіла цікавасць даследчыкаў да гэтых помнікаў.

На цяперашні час вядома пра існаванне пяці саламяных Царскіх Брамаў, з якіх захаваліся тры, і яшчэ адна адлюстравана на фотаздымку 1925 г. Усе гэтыя саламяныя вароты належаць да лакальнай традыцыі, якая існавала на Пінскім Палессі (Пінскі і Кобрынскі паветы) у першай палове XIX ст. Магчыма, некаторыя з гэтых сакральных дзвярэй былі сплецены для іканастасаў яшчэ ва ўніяцкія часы, а таму з’яўляюцца прадметам і нашага разгляду. Так, у НММ РБ захоўваюцца Царскія Брамы з в. Вавулічы Драгічынскага р-на (*іл. 15*) і в. Лемяшэвічы Пінскага р-на, у Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі-запаведніку – з в. Ляскавічы Іванаўскага р-на. В. А. Лабачэўская ў Нацыянальным музеі Літвы адшукала ўнікальны фотаздымак, зроблены ў 1925 г. слуцкім фатографам С. Юхніным, на якім прадстаўлена страчаная Царская Брама з в. Іванчыцы Ровенскай вобл. Украіны (на памежжы з Пінскім раёнам). А таксама па літаратурных крыніцах вядома пра існаванне саламяных іканастасных дзвярэй у царкве в. Горкі Валынскай вобл. Украіны (на памежжы з Іванаўскім раёнам), якая згарэла ў 1900-ыя гг. [20].

Даследчыкамі, якія папярэдне звярталіся да гэтай мастацкай з’явы, пералічаныя помнікі датаваліся канцом XVIII ст. і прыпісваліся да спадчыны ўніяцкай Царквы [15, іл. 120]. За выключэннем вавуліцкай Царскай Брамы, пра якую вядомы і перыяд стварэння – паміж 1830-ым і 1840-ым гадамі, і імя аўтара – Клімовіч [20, с. 61–62]. Адразу ж адзначым, што як мінімум лемяшэвіцкая Царская Брама была створана не ў XVIII ст., а пазней. Так, у візітах за 1799 г. па гэтай цэркве зафіксаваны два алтары: галоўны і бакавы [22, арк. 126–126 адв.]. Іканастас не згадваецца, відавочна, што яго не было. У любым выпадку, на самы канец XVIII ст. у лемяшэвіцкай царкве і пры апісанні іншых месцаў храма не згадваецца наяўнасць ніякай Царскай Брамы, што, дарэчы, часам здаралася ў іншых выпадках, дзе, напрыклад, па сценах маглі быць развешаны іканастасныя абразы пасля яго разабрання або пасля замены ікон на новыя. У гэтай жа справе фігуруе і іванчыцкая царква, пра якую адзначана, што яна знаходзіцца ў вельмі дрэнным стане, а таму яе начынне не апісваецца [22, арк. 63].

Даследчыца В. А. Лабачэўская ў сваёй новай кнізе (2018), прысвечанай гэтым помнікам, прывяла новую атрыбуцыю, якая, на нашую думку, з’яўляецца больш слушнай за папярэднюю. Так, яна прапанавала прыняць наступны час стварэння: 1) Лемяшэвіцкія вароты – 1810 г., 2) Горацкія – 1815 г., 3) Вавуліцкія – 1835 г., 4) Ляскавіцкія – 1836 – 1838 гг., 5) Іванчыцкія вароты – 1830-ыя гг.



*Іл. 15. Царская Брама з в. Вавулічы Драгічынскага р-на. НММ РБ*

Датаванне было акрэслена на падставе наступных акалічнасцяў:

1) у 1810 г. у Лемяшэвічах быў узведзены новы царкоўны будынак, для іканастаса якога, як лічыць В. А. Лабачэўская, і была выканана саламяная Царская Брама;

2) у 1815 г. аналагічная сітуацыя адбылася ў Горках;

3) "вавуліцкія вароты былі створаны хутчэй за ўсё пры пераабсталяванні храма ў 1845 г." – тут, верагодна, абдрукоўка ў даце, бо ў іншым месцы тэкста аўтар вядзе размову пра 1835 г.

4) іканастас у Ляскавіцкай царкве быў усталяваны пасля 1836 г., верагодна тады ж і былі зроблены саламяныя вароты;

5) па Іванчыцкай царкве В. А. Лабачэўскай крыніцы не вядомыя, аднак на падставе аналогіі, браму адсюль яна датавала 1830-ымі гадамі [20, с. 97–99].

Але на нашую думку, усе гэтыя брамы былі выкананы ў адзін прамежак часу – перыяд пераабсталявання уніяцкіх цэркваў у адпаведнасці з усходнім абрадам, што адбывалася ў 1830-ыя гг. Выказаць такую версію дазваляюць выяўленыя намі звесткі з архіўных дакументаў 1830-х гг., якія захоўваюцца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве у Вільні (далей – LVIA, Lietuvos valstybės istorijos archyvas). У справе за 1837 г., дзе прадстаўлена зводная інфармацыя пра пераабсталяванне інтэр'ераў грэка-каталіцкіх цэркваў Літоўскай епархіі, згадваюцца і неабходныя для нашага разгляду храмы. Так, на гэты час вавуліцкая, ляскавіцкая і горацкая цэрквы ўваходзілі ў склад Драгічынскага благачыння (у той час у справаводстве ўніяцкай царквы ўжо ўжываўся менавіта гэты тэрмін, замест папярэдняга – "дэканат") [6, арк. 5 адв. – 6 адв.], а лемяшэвіцкая і іванчыцкая – Пінскага [6, арк. 59 адв.].

Для чатырох з іх, акрамя іванчыцкай, у справе за 1837 г. адзначаецца, што іканастасы ўсталяваны ў апошнія гады. Відавочна, што і Царскія Брамы, як галоўныя кампаненты іканастаса, былі зроблены ў гэты ж час. Па ўсёй верагоднасці, перыядам стварэння з'яўляюцца 1834–1836 гг., бо ў гэтыя гады ўніяцкія цэрквы прыводзіліся ў той выгляд, якога вымагалі кансісторыі – яны павінны былі забяспечыцца іканастасамі і іншымі неабходнымі для набажэнства па ўсходнім абрадзе рэчамі і пазбавіцца ад "атрыбутаў лацінства" – прысценных алтароў, арганаў, амвонаў, лавак. Што датычыцца Іванчыцкай царквы і яе абсталявання, то ў названым дакуменце зроблены наступны запіс пра іканастас: "не имеется и богослужение прекращено" [6, арк. 59 адв.]. Гэты храм прыведзены ў спісе прыпісных, а не прыхадскіх.

У Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве (Lietuvos valstybes istorijos archyvas, далей LVIA) знаходзіцца іншая справа, якая распачалася 13 красавіка 1836 г. і датычыцца Пінскага дэканату, у склад якога ўваходзілі два цікавыя для нашага разгляду храмы [10]. Гэтая крыніца храналагічна папярэднічае вышэй названай і, відавочна, перш чым быў складзены зводны дакумент па Літоўскай епархіі ў 1837 г., такога кшталту справы вяліся па ўсіх дэканатах. У ёй згадваецца і лемяшэвіцкая царква, дзе на красавік 1836 г., што вынікае з рапарта Пінскага дэкана (благачыннага) у Літоўскую грэка-каталіцкую кансісторыю, іканастас ужо існаваў і, відавочна, быў зроблены ў паміж 1834 і 1836 гг. у адпаведнасці з загадам па ўсталяванні іканастасаў [10, арк. 3].

У рапартах за 24 мая і 26 чэрвеня 1836 г. фігуруе іванчыцкая царква, пра якую адзначаецца, што там іканастаса няма [10, арк. 3–5 адв.]. На гэты час храм ужо быў не прыхадскі, а – прыпісны. У далейшых распараджэннях і справаздачах, падшытых у названую справу па Пінскім дэканаце, згадак пра Іванчыцкую царкву няма. Як бачна з прыведзеных вышэй звестак, іканастас там і не быў зроблены на 1837 г., калі амаль усе цэрквы епархіі ўжо былі абсталяваны на грэчаскі лад. На жаль, так пакуль і не ўдалося высветліць, калі ўсё ж у гэтым храме з’явіўся іканастас. Магчыма, гэта адбылося і не хутка, бо калі храм быў пераведзены ў лік прыпісных, то гэта, натуральна, не садзейнічала яго фінансаваму забеспячэнню. Магчыма, іканастас там быў уладкаваны ўжо пасля 1839 г., калі царква стала праваслаўнай.

Надзвычай каштоўная знаходка намі была здзейснена зусім нядаўна ў фондах LVIA – выяўлена архіўная справа, дзе ідзе гаворка пра ўладкаванне іканастасаў у цэрквах Драгічынскага дэканату ў 1836–1837 гг. Дагэтуль гэтая крыніца была невядомай. Тут у рапарце драгічынскага благачыннага ад 2-га красавіка 1836 г. паведамляецца пра ступень гатоўнасці іканастасаў у падначаленых яму цэрквах. Пра вавуліцкую і ляскавіцкую гаворыцца: “Царские двери искусно соломою украшены” [5, арк. 1 адв., 3 адв.].

Іканастас у горацкай царкве на той час яшчэ нават быў не пачаты. У далейшых дакументах паведамляецца пра паступовае вырашэнне гэтага пытання. На 21 верасня 1836 г. ён пачаў вырабляцца (будаваў яго сам святар гэтага храма); на 30 кастрычніка ён ужо быў завершаны, аднак, відавочна, яшчэ не пафарбаваны [5, арк. 44 адв., 48, 52]. Не было тады ў ім і абразоў. Пра Царскую Браму гаворка ў той час таксама не ідзе. Але, як было адзначана вышэй, на 1837 г., што прадстаўлена ў зводнай табліцы па Літоўскай епархіі, іканастас і ў горацкай царкве быў гатовы.

Такім чынам, усе вядомыя беларускаму мастацтвазнаўству саламяныя Царскія Брамы з’яўляюцца не толькі лакальнай тэрытарыяльнай традыцыяй, але і храналагічнай: яны былі зроблены ў апошнія гады існавання Уніі: лемяшэвіцкая, вавуліцкая, ляскавіцкая ў 1834–1836 гг. (менавіта ў гэты час у адпаведнасці з распараджэннем ажыццяўлялася пераабсталяванне інтэр’ераў уніяцкіх храмаў на грэчаскі лад), горацкая ў 1836–1837 гг., іванчыцкая пасля 1837 г. Тыя гістарычныя абставіны, якія мелі месца ў 1830-ыя гады, сталі штуршком для з’яўлення такой ўнікальнай, самабытнай, выключна беларускай мастацкай з’явы, як сакральныя прадметы, выкананыя з саломкі.

**Падводзячы высновы** адносна Царскіх Брамаў з уніяцкіх іканастасаў падкрэслім некалькі момантаў. Па-першае, ад XVII ст. захаваліся помнікі, дзе яшчэ няма скразной разьбы, якая з другой паловы XVII ст. і ў XVIII ст. была асноўным выяўленчым сродкам у такога кшталту прадметах. У гэтым можа назірацца пэўная архаічнасць, схільнасць да захавання старых традыцый. Разам з тым, да гэтага ж перыяду адносяцца Царскія Брамы з барэльефамі, у якіх прадстаўлены чатыры евангелісты і Дабравесце. Найчасцей такія выявы былі выкананы жывапісна. Пра выкарыстанне рэльефнай разьбы для аздобы не толькі іканастасных, але і храмавых дзвярэй сведчаць два прыклады XVII ст. з Віцебска.

Аднак у гэты ж час выкарыстоўваюцца і праразныя Царскія Брамы. У перыяд высокага барока такі спосаб вырабу дасягнуў свайго росквіту. Царскія Брамы былі ажурнымі за кошт дэкаратыўнай разьбы. Матывы, якія сустракаліся найчасцей – лаза з гронкамі вінаграду, кветкі. У другой палове XVIII ст. пад уплывам стылю ракако пачынае шырока ўжывацца матыў “трэльяж” або, як яго апісвалі візітатары таго часу, – Царскія Брамы “у краткі”.

У познеўніяцкі перыяд (першая трэць XIX ст.), які супадае з панаваннем стылю класіцызму на нашых землях, кампазіцыйным цэнтрам сакральных дзвярэй робіцца крыж, ад якога разыходзяцца “прамяні” – вузкія драўляныя планачкі, якія запаўнялі аснову. Да іх мацаваліся жывапісныя клеймы. У такіх Царскія Брамах яны, звычайна, ужо не складалі агульную кампазіцыю з разьбой, як было ў эпоху барока, а проста асобна прымацоўваліся. Хаця падкрэслім, што і ў першай трэці XIX ст. майстраваліся Царскія Брамы, дзе аснову складала скразная разьба, сярод якой гарманічна былі ўпісаны жывапісныя медальёны.

Да гэтага ж перыяду належаць унікальныя помнікі беларускай сакральнай культуры і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – саламяныя Царскія Брамы. Нашымі папярэднікамі яны разглядаліся як спадчына ўніяцкай Царквы. Як паказала даследаванне, яны былі зроблены ўжо ў той час, калі рыхтаваўся перавод храмаў у праваслаўе і менавіта гістарычныя абставіны таго часу паўплывалі на ўзнікненне такой самабытнай з’явы.

1. Archiwum Państwowe w Lublinie (далей – APL). Chełmski Konsystorz Grecko-katolicki (CGKK). Sygn. 109: Генеральныя візіты грэка-каталіцкіх цэркваў Драгічынскага дэканата, 1757 г. 183 арк.

2. APL. CGKK. Sygn. 143: Генеральныя візіты грэка-каталіцкіх цэркваў Полацкай архіепархіі (той часткі былой Полацкай архіепархіі, якая пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай засталася на яе тэрыторыі), 1789–1790 гг.181 арк.

3. Lietuvos mokslu akademijos biblioteka (далей – LMAB). Рукапісны аддзел (RS). F. 41. Sygn. 107–212: Інвентары і візіты цэркваў Вілейскага павета, 1784–1827 гг. 320 арк.

4. LMAB. RS. F 41. Sygn. 225–394: Генеральныя візіты цэркваў Бяльскага, Бельскага, Брэсцкага, Драгічынскага, Мельніцкага дэканатаў, 1759 г. 1036 с.

5. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (далей – LVIA). F. 605. Ap. 1. B. 2487: Справа пра ўсталяванне іканастасаў у цэрквах Драгічынскага грэка-каталіцкага деканату, 1836–1839 гг. 183 арк.

6. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 4: Ведамасці пра ўладкаванне ўніяцкіх цэркваў Літоўскай епархіі, 1837 г. 98 арк.

7. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 48: Генеральныя візіты цэркваў Пружанскага, Кобрынскага, Палескага, Камянецкага і Уладаўскага грэка-каталіцкіх дэканатаў, 1759 г. 450 с.

8. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 53: Генеральныя візіты цэркваў Лідскага і Слонімскага грэка-каталіцкіх дэканатаў, 1784 г. 129 арк.

9. LVIA. F. 634. Ap. 1. B. 57: Генеральныя візіты цэркваў Камянецкага грэка-каталіцкага дэканата, 1802 г. 140 арк.

10. LVIA. F. 634. Ap. 2. B. 400: Справа пра ўсталяванне іканастасаў у цэрквах Пінскага грэка-каталіцкага деканату, 1836 г. 25 арк.

11. Tomalska J. Uwagi na temat wyposażenia cerkwi Zwiastowania w Supraślu w XVI i XVII weku. *Studia Podlaskie*. Białystok, 2012. T. XX. S. 27–53.

12. Беларускі іканастас. Творы іканапісу і драўлянай пластыкі канца XVII – пачатку XIX ст. Буклет да выстаўкі ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь / склад. А. Карпенка, аўтар тэксту А. Ярашэвіч. Мінск, 2015. 52 с.

13. Беларусы. Мінск: Бел. навука, 2005. Т. 8: Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / Я. М. Сахута; рэдкал.: А.І. Лакотка [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. 351 с.: іл.

14. Высоцкая Н. Ф. Царская брама. *Мастацтва Беларусі*. 1984. № 8. С. 57–58.

15. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII–XVIII стагоддзяў / аўтар тэксту і складальнік Н. Ф. Высоцкая. Мінск: Беларусь, 1984. 15 с.: [174] арк. іл.

16. Жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў / аўтар тэксту і складальнік Н. Ф. Высоцкая. Мінск: Беларусь, 1980. 17 с.: [164] арк. іл.

17. Институт истории материальной культуры Российской академии наук (далей – ИИМК РАН). Рукописный отдел. Ф. I. 1910. Д. 298: Справа пра прыняцце захадаў да падтрымкі ад разбурэння драўлянай царквы Св. Троіцы ў Віцебску, 1910–1915 гг. 33 л.

18. ИИМК РАН. Рукописный отдел. Ф. I. 1913 г. Д. 100: Справа пра мяркуемы знос царквы ў в. Галоўчыцы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні, 1913 г. 8 л.

19. Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў / аўтар тэксту і складальнік Н. Ф. Высоцкая. Мінск: Беларусь, 2001. 21 с.: [139] арк. іл.

20. Лабачэўская В. А. Мастацтва дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-кальтавыя прадметы. Мінск: Беларуская навука, 2018. С. 263 с.: іл.

21. Музей старажытнабеларускай культуры: альбом / укл. А. А. Ярашэвіч. Мінск: Беларусь, 2004. 284 с.

22. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41247: 23. Генеральныя візіты цэркваў Пінскай сурагацыі (цэркваў былых Любяшоўскага, Нобельскага, Пагосцкага, Пінскага, Столінскага, Янаўскага дэканатаў, якія засталіся ўніяцкімі пасля скасавання Турава-Пінскай епархіі ў 1795 г.), 1799 г. 144 арк.

23. НГАБ. Ф. 1781. Воп. 26. Спр. 1410: Генеральныя візіты грэка-каталіцкіх цэркваў Віцебскага, Веліжскага, Веляшковіцкага, Мікулінскага, Задзвінска-Бешанковіцкага дэканатаў, 1822 г. 224 арк.

24. Ожешковская И. Н. Стилистика алтарной преграды Витебского Успенского собора II-ой половины XVIII – начала XIX вв. (по материалам архивных исследований). *Архитектура*: Вестник Брестского государственного технического университета. Брест, 2012. № 1 (73). С. 14–18.

25. Пластыка Беларусі XII–XVIII стст. / аўтар і складальнік Н. Ф. Высоцкая. Мінск, 1983. 231 с.

26. Помнікі мастацкай культуры Беларусі / укл. Б. А. Лазука. Мінск: Беларусь, 2012. 415 с.

27. Российский государственный исторический архив (далей – РГИА). Ф. 823. Оп. 3. Д. 531: Візіты грэка-каталіцкіх цэркваў у м. Лебедзева, Полава, в. Рускае Сяло, Цешылава Ашмянскага павета, в. Бялавічы Слонімскага павета, 1738 г. 8 арк.

28. РГИА. Ф. 824. Оп. 2. Д. 182: Генеральныя візіты грэка-каталіцкіх цэркваў Мсціслаўскага, Запалянскага і Засожскага дэканатаў, 1822–1823 гг. 177 арк.

29. Скульптура и резьба на Беларуси XII–XVIII веков: каталог / авт.-сост. Н.Ф. Высоцкая. Мінск: БелЭн, 1998. 224 с.: ил.

30. Флікоп-Світа Г. А. Беларускі іканапіс XVI – першай паловы XX ст.: альбом / навук. рэд. Б.А. Лазука. Мінск: Беларуская навука, 2019. 365 с.: іл.

31. Флікоп-Світа Г. А. Іканапісец Стэфан Пятровіч Сулкоўскі – невядомае імя ў гісторыі беларускага мастацтва XIX ст. *Беларускі гістарычны часопіс*. 2015. № 9. С. 23–36.

32. Флікоп-Світа Г. А. Чарцяжы іканастасаў Ухвальскай і Сокальскай цэркваў Барысаўскага павета з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. *Гістарыяграфія і крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі: традыцыі і навацыі*. Мінск: Беларуская навука, 2018. С. 312–319.

33. Ярошевич А. А. От ренессанса к барокко: мемориальная и алтарная пластика Беларуси XVI–XIX веков. Минск: Беларусь, 2019. 191 с.: ил.

**References**

1. Archiwum Państwowe w Lublinie (dalei – APL). Chełmski Konsystorz Grecko-katolicki (CGKK), sygn. 109: Heneralnyia vizity hreka-katalitskikh tserkvaw Drahichynskaha dekanata, 1757 h. 183 ark. (in Pol.).

2. APL. CGKK, sygn. 143: Heneralnyia vizity hreka-katalitskikh tserkvaw Polatskaj arkhieparkhii (toi chastki byloj Polatskai arkhieparkhii, jakaja paslia pershaha padzelu Rechy Paspalitaj zastalasia na jae terytoryi), 1789–1790 hh.181 ark. (in Pol.).

3. Lietuvos mokslu akademijos biblioteka (dalei – LMAB). Rukapisny addzel (RS), f. 41, sygn. 107–212: Inventary i vizity tserkvaw Vilejskaha paveta, 1784–1827 hh. 320 ark. (in Pol.).

4. LMAB. RS, f. 41, sygn. 225–394: Heneralnyia vizity tserkvaw Bialskaha, Belskaha, Brestskaha, Drahichynskaha, Melnitskaha dekanataw, 1759 h. 1036 s. (in Pol.).

5. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (dalei – LVIA), f. 605, ap. 1, b. 2487: Sprava pra wstaliavanne ikanastasaw u tserkvakh Drahichynskaha hreka-katalitskaha dekanatu, 1836–1839 hh. 183 ark. (in Rus.).

6. LVIA, f. 634, ap. 1, b. 4: Vedamastsi pra wladkavanne wnijatskikh tsterkvaw Litowskaj eparkhii, 1837 h. 98 ark. (in Rus.).

7. LVIA, f. 634, ap. 1, b. 48: Heneralnyia vizity tserkvaw Pruzhanskaha, Kobrynskaha, Paleskaha, Kamianetskaha i Uladawskaha hreka-katalitskikh dekanataw, 1759 h. 450 s. (in Pol.).

8. LVIA, f. 634, ap. 1, b. 53: Heneralnyia vizity tserkvaw Lidskaha i Slonimskaha hreka-katalitskikh dekanataw, 1784 h. 129 ark. (in Pol.).

9. LVIA, f. 634, ap. 1, b. 57: Heneralnyia vizity tserkvaw Kamianetskaha hreka-katalitskaha dekanata, 1802 h. 140 ark. (in Pol.).

10. LVIA, f. 634, ap. 2, b. 400: Sprava pra wstaliavanne ikanastasaw u tserkvakh Pinskaha hreka-katalitskaha dekanatu, 1836 h. 25 ark. (in Rus.).

11. Tomalska, J. (2012). Uwagi na temat wyposażenia cerkwi Zwiastowania w Supraślu w XVI i XVII weku, *Studia Podlaskie*, Białystok, t. XX, s. 27–53. (in Belar.)

12. (2015). Belaruski ikanastas. Tvory ikanapisu i drawlianaj plastyki kantsa XVII – pachatku XIX st. Buklet da vystawki w Natsyjanalnym mastatskim muzei Respubliki Belarus, sklad. A. Karpenka, awtar tekstu A. Jarashevich, Minsk, 52 s. (in Belar.).

13. (2005). Belarusy, Minsk, Bel. navuka, t. 8: Dekaratywna-prykladnoe mastatstva / Ja. M. Sakhuta; redkal.: A.I. Lakotka [i insh.]; Nats. akad. navuk Belarusi, In-t mastatstvaznawstva, etnahrafii i falkloru imia K. Krapivy, 351 s.: il. (in Belar.).

14. Vysotskaia, N. F. (1984). Tsarskaia brama. *Mastatstva Belarusi*, no. 8, s. 57–58. (in Belar.).

15. (1984). Dekaratywna-prykladnoe mastatstva Belarusi XII–XVIII stahoddziaw, awtar tekstu i skladalnik N.F. Vysotskaia, Minsk, Belarus, 15 s.: [174] ark. il. (in Belar.).

16. (1980). Zhyvapis Belarusi XII–XVIII stahoddziaw / awtar tekstu i skladalnik N. F. Vysotskaia, Minsk, Belarus, 17 s.: [164] ark. il. (in Belar.).

17. Institut istorii materialnoj kultury Rossijskoj akademii nauk (dalei – IIMK RAN). Rukopysnyj otdel. F. I. 1910. D. 298: Sprava pra pryniatstse zakhadaw da padtrymki ad razburennia drawlianai tsarkvy Sv. Troitsy w Vitsebsku, 1910–1915 hh. 33 l. (in Rus.).

18. IIMK RAN. Rukopysnyj otdel. F. I. 1913 h. D. 100: Sprava pra miarkuemy znos tsarkvy w v. Halowchytsy Kobrynskaha paveta Hrodzenskaj huberni, 1913 h. 8 l. (in Rus.).

19. (2001). Ikanapis Belarusi XV–XVIII stahoddziaw / awtar tekstu i skladalnik N. F. Vysotskaja, Minsk, Belarus, 21 s.: [139] ark. il. (in Belar.).

20. Labachewskaia V. A. (2018). Mastatstva dzelia slavy Bozhaj: salamianyja ikanastasnyja varoty i tsarkowna-kultavyja pradmety, Minsk, Belaruskaja navuka, 263 s.: il. (in Belar.).

21. Muzei starazhytnabelaruskaj kultury: albom / ukl. A.A. Jarashevich, Minsk, Belarus, 2004, 284 s. (in Belar.).

22. Natsyjanalny histarychny arkhiw Belarusi (dalei – NHAB), f. 136, vop. 1, spr. 41247: Heneralnyja vizity tserkvaw Pinskaj surahatsyi (tserkvaw bylykh Liubiashowskaha, Nobelskaha, Pahostskaha, Pinskaha, Stolinskaha, Janawskaha dekanataw, jakija zastalisia wnijatskimi paslia skasavannia Turava-Pinskai eparkhii w 1795 h.), 1799 h. 144 ark. (in Pol.).

23. NHAB, f. 1781, vop. 26, spr. 1410: Heneralnyja vizity hreka-katalitskikh tserkvaw Vitsebskaha, Velizhskaha, Veliashkovitskaha, Mikulinskaha, Zadzvinska-Beshankovitskaha dekanataw, 1822 h. 224 ark. (in Pol.).

24. Ozheshkovskaja, I. N. (2012). Stilistika altarnoj pregrady Vitebskogo Uspenskogo sobora II-oj poloviny XVIII – nachala XIX vv. (po materialam arhivnyh issledovanij). *Arhitektura*: Vestnik Brestskogo gosudarstvennogo tehnicheskogo universiteta, Brest, no. 1 (73), s. 14–18. (in Rus.).

25. (1983). Plastyka Belarusi XII–XVIII st., awtar i skladalnik N. F. Vysotskaja, Minsk, 231 s. (in Belar.).

26. (2012). Pomniki mastatskaj kultury Belarusi, ukl. B.A. Lazuka, Minsk, Belarus, 415 s. (in Belar.).

27. Rossiiskij gosudarstvennyj istoricheskij arhiv (RGIA), f. 823, op. 3, d. 531: Vizity hreka-katalitskikh tserkvaw u m. Lebedzeva, Polava, v. Ruskae Sialo, Tseshylava Ashmianskaha paveta, v. Bialavichy Slonimskaha paveta, 1738 h. 8 ark. (in Pol.).

28. RGIA, f. 824, op. 2, d. 182: Heneralnyja vizity hreka-katalitskikh tserkvaw Mstsislawskaha, Zapalianskaha i Zasozhskaha dekanataw, 1822–1823 hh. 177 ark. (in Pol.).

29. (1998). Skulptura i rezba na Belarusi XII–XVIII vekov: katalog / avt.-sost. N. F. Vysotskaja, Minsk, BelEn, 224 s.: il. (in Belar.).

30. Flikop-Svita, H. A. (2019). Bielaruski ikanapis XVI – piershaj palovy XX st.: al’bom, Minsk. [in Belar.].

31. Flikop-Svita, H. A. (2015). Ikanapisiec Stefan Piatrovich Sulkowski – nieviadomaie imia w historyi bielaruskaha mastactva XIX st. *Bielaruski histarychny chasopis*, no. 9, s. 23–36. [in Belar.].

32. Flikop-Svita, H. A. (2018). Charciazhy ikanastasaw Uhval’skaj i Sokal’skaj cerkvaw Barysawskaha pavieta z fondaw Nacyianal’naha histarychnaha arhiva Bielarusi. *Histaryiahrafiia i krynicy vyvuchennia historyi Bielarusi: tradycyi i navacyi*, Minsk, s. 312–319. [in Belar.].

33. Jarashevich, A. A. (ukladal’nik, 2004). *Muziej starazhytnabielaruskaj kul’tury: al’bom*, Minsk. [in Belar.].